# ФОЛЬКЛОРИСТИКА И ЭТНОГРАФИЯ

*УДК 392.5(476.2-37Жлобін)*

**А. А. Арол**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

## ВЯСЕЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ ВЁСКІ ЧЫРВОНЫ БЕРАГ ЖЛОБІНСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ: МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА

*У артыкуле, прысвечаным вясельнай абраднасці вёскі Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна, характарызуюцца асобныя абрадавыя этапы вяселля. На аснове апублікаваных матэрыялаў, а таксама ўласна запісаных звестак аўтар выяўляе мясцовую спецыфіку вяселля асобнай вёскі.*

Вяселле – гэта ўрачыстая цырымонія, якая суправаджае заключэнне шлюбу. Вялікая сацыяльная роля гэтай абраднасці заключаецца ў стварэнні новай сям'і, у замацаванні сваяцтва паміж рознымі родамі. Варта адзначыць, што ў правядзенні сучаснага вяселля маюць месца асобныя элементы класічнай беларускай вясельнай абраднасці. Даследаванне асаблівасцей святкавання вяселля ў асобных раёнах Гомельскай вобласці, у прыватнасці, у розных вёсках Жлобінскага раёна надзвычай важна для сістэмнага вывучэння вясельнай абраднасці Гомельшчыны.

Фактычны матэрыял, уласна запісаны ў в. Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна і апублікаваны ў фальклорных зборніках, дае падставы назіраць адметныя мясцовыя рысы, якія выяўляюцца ў правядзенні асобных абрадавых этапаў і звязаных з імі рытуалах, прыкметах і павер'ях, песенным суправаджэнні. Звернем увагу на той факт, што раней вяселле было не аднадзённай урачыстасцю, а ахоплівала значны прамежак часу выканання неабходных вясельных абрадавых этапаў. Варта падкрэсліць, што ніводнае дзеянне ў вясельнай абраднасці не было выпадковым або незапланаваным, пачынаючы ад сватання і заканчваючы паслявясельнай часткай.

У структуры вясельнай абраднасці в. Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці выдзяляюцца наступныя абрадавыя этапы: сватанне, зборная субота, пасад, выкуп нявесты, вянчанне, уласна вяселле, дзяльба каравая, паслявясельная частка.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Сватанне – гэта давясельны абрадавы этап, які вылучаўся рытуальным дыялогам, які адбываўся паміж бацькамі нявесты і бацькамі жаніха, напрыклад: «Мы людзі з далёкага краю, прытаміліся. Ці пусціце пераначаваць?» Бацька маладой адказвае: «Заходзьце, госці дарагія». Тады сват гаворыць: «Мы чулі, у вас дачка ёсць, Ваш тавар, наш купец» [1, с.135].

Як адзначаюць даследчыкі, у прыведзеным вышэй апісанні рытуальнага дыялогу знайшлі адлюстраванне старадаўнія ўяўленні, звязаныя з купляй-продажам нявесты. Зыходзячы з успамінаў інфармантаў, у в. Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна «ў сваты звычайна ідуць вечарам у суботу: сват, жаніх, яго родны бацька, хрышчоны бацька, брат і родныя дзядзькі. Сваты павінны весці куплю-продаж нявесты. У хаце нявесты ведаюць пра прыезд сватоў і рыхтуюцца» (запісана ў в. Чырвоны Бераг ад Гурчанка Вольгі Сяргееўны, 1964 г. н.).

Сімвалам згоды на шлюб у в. Чырвоны Бераг з'яўляліся ручнік і хустка, падараваныя нявестай бацькам жаніха: «Калі дзяўчына згодна выйсці замуж, то дарыць радзіцелям жаніха ручнік, а маці хустку» [1, с. 135].

Падчас сватання выконвалі песні:

*Прыехалі сваты на двор,*
*Пусцілі стралу ў акно.*
*– Страла, мая, страла,*
*Па што ты прыйшла?*
*Ці па мёд, ці па гарэлку,*
*Ці па нашу дзеўку?*
*Будзе чужой мамачцы гадзіці,*
*Ад зары да зары рабіці.*
*Татулька і матулька журацца:*
*– Гадавалі дачушку на долю,*
*А цяпер аддалі ў няволю* (в. Чырвоны Бераг) [1, с. 136].

У вясельнай традыцыі в. Чырвоны Бераг звычайна на сватанні дамаўляюцца аб тым, калі праводзіць вяселле, вырашаюць пытанні яго арганізацыі.

Да вяселля нявеста павінна насіць заплеценую касу, што сімвалізавала яе дзявочую прыгажосць. Пасля завяршэння вясельнай цырымоніі ўжо нельга было хадзіць з касой. Звычайна развітанне маладой з дзявоцтвам адбывалася ў зборную суботу, калі да яе прыходзілі дзяўчаты-сяброўкі, каб завіць вяночак. У в. Чырвоны Бераг менавіта «ў пятніцу вечарам збіраюцца дзяўчаты, плятуць вянок для маладой, а потым уюць в'ёльца (ёлку). Калі ўкрашаюць ёлку, пяюць:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*– Ой, хвоя, хвоя зелена.*
*Ты ў бару расла, шумела,*
*Ты ў бару расла, шумела,*
*На стале стала – заззяла.*
*Ты ў бару расла, шумела,*
*З корня ўпала, завяла* (в. Чырвоны Бераг) [2, с. 190].

Калі бацькі нявесты сустракаюць маладых, то выносяць з хаты стол, на які ставяць абраз, кладуць каравай, соль і ставяць гарэлку. У гэты момант жаніх і нявеста, зыходзячы з народных вераванняў, імкнуліся вызначыць, хто з іх будзе лідарам: «*Каб узнаць, хто ў доме будзе гаспадаром, бацькі давалі жаніху ды нявесце па чарзе адкусіць каравай, у каго кавалачак большы, той гаспадаром і будзе. Пасля таго, яны павінны былі добра памачыць свой кавалачак ў соль, а потым накарміць адзін аднаго. Усе, хто быў у гэты момант, жадалі маладым, каб гэты каравай быў адзінай гораччу ў жыцці»* (запісана ў в. Чырвоны Бераг ад Гурчанка Вольгі Сяргееўны, 1964 г. н.).

Падчас благаславення маладых выкарыстоўвалі не толькі абраз, але мёд і зерне, якім надавалася магічнае значэнне. Семантыка названых прадметных атрыбутаў была звязана з пажаданнямі багацця і дабрабыту маладым: «*Пасля каравая маці жаніха карміла маладых мёдам, каб ім салодка жылося, а маці нявесты падносіла да іх ікону, каб яны пакланіліся. Таксама маладых абсыпалі зернем: аўсом – на багацце, грэчкай – на здароўе і доўгае жыццё»* (запісана ў в. Чырвоны Бераг ад Гурчанка Вольгі Сяргееўны, 1964 г. н.).

На вяселлі зяць абавязкова павінен быў абуць цешчу: «Перад гэтым цёшчу абуваюць у пасталы. Зяць знімае пасталы і абувае боты. Цёшчу садзяць на стула, а кругом яе водзяць харавод і пяюць:

*– А то ж тыя чобаты,*
*Што зяць даў,*
*Ён за тыя чобаты*
*Дачку ўзяў.*
*Павешу я чобаты на кручку,*
*Няхай робяць дзелачка на дачку.*
*Чобаты, чобаты, вы мае,*
*Нарабілі клопату, да вы мне.*
*А то тыя чобаты з бугая,*
*Не баяцца холаду нічарта»* (в. Чырвоны Бераг) [2, с. 190-191].

На вяселлі нявеста павінна была надзяліць падарункамі ўсю радню жаніха.

Заслугоўваюць увагі сведчанні інфарманта наконт абраду вянчання: «На наступны дзень пасля вяселля, у нядзелю, маладыя пры-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ступалі к свайму вянцу. З імі ў царкву ехалі толькі хросныя бацька і матка, дружка і друг. Маладым слалі пад ногі палаценца і на рагі клалі грошы, каб маладыя былі багатымі» (запісана ў в. Чырвоны Бераг ад Гурчанка Вольгі Сяргееўны, 1964 г. н.).

Паслявясельную частку ў в. Чырвоны Бераг таксама адзначалі: «Але вяселле яшчэ не заканчваецца. На другі дзень у госці да бацькоў нявесты ідуць у адведкі сваякі жаніха з маладымі. На наступны дзень ужо бацькі нявесты ідуць у адведкі ў хату маладога» (в. Чырвоны Бераг) [1, с. 138]. Паслявясельная частка мела назву «*Петухі*». Паводле сведчанняў жыхароў, выбіралі маладых, якіх апраналі наадварот і якія з гасцямі хадзілі па дварах аднавяскоўцаў, дзе ім давалі «куру» або «петуха»: «Убіраюць маладых: маладога – у дзеўку, маладую – у хлопца і ходзяць па дварах. І гаспадар, к якому завітаюць госці, павінен даць куру ці петуха» (в. Чырвоны Бераг) [1, с. 139]. Як правіла, госці пераапраналіся «ў цыган»: «Госці – жанчыны і мужчыны – прыбіраюцца ў цыган» (в. Чырвоны Бераг) [1, с. 139].

Такім чынам, прыведзеныя матэрыялы па вясельнай абраднасці Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці яскрава дэманструюць асаблівасці мясцовай вясельнай традыцыі в. Чырвоны Бераг.

**Спіс літаратуры**

1 Вясельная традыцыя Гомельшчыны: фальклорна-этнаграфічны зборнік / укладанне В. С. Новак; Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Мінск; Права і эканоміка, 2011. – 485 с.

2 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік. – ЛМФ «Нёман», 2003. – 472 с.

*УДК 392.1(476.2-37 Хойнікі)*

**Х. В. Бусева**

***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

## ТРАДЫЦЫІ РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ ХОЙНІЦКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Артыкул прысвечаны характарыстыцы радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Хойніцкага раёна. Былі прааналізаваны структурныя кампаненты традыцыйнага радзінна-хрэсьбіннага абрадавага*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ